**Храпавіцкая, Н.** Успаміны як невылечныя раны... / Н. Храпавіцкая // Лепельскі край. — 2021. — 5 лют. — С. 10.

**УСПАМІНЫ ЯК НЕВЫЛЕЧНЫЯ РАНЫ...**

Прапаршчык Ігар Яўгенавіч Макарэвіч у Афганістане служыў з 14 мая 1984 па 4 чэрвеня 1987 года. Узнагароджаны ордэнам «За службу Радзіме ва УС СССР» III ступені і медалём «За баявыя заслугі».



**Ігар і Галіна Макарэвічы**

15 лютага 1989 года завяршыўся вывад савецкіх войскаў з Афганістана. Далёкія падзеі ў той паўлнёвай краіне засталіся невылечнымі ранамі на сэрцах многіх людзей. Вайна доўжылася амаль 10 гадоў і назаўжды сышла ў мінулае.

Аднак рэха вогненных гор многія адчуваюць і да гэтага часу. Яно – ва ўспамінах удзельнікаў тых падзей, а таксама ў незагойнай ране бацькоў, чые сыны не вярнуліся з вайны.

Напярэдадні памятнай даты давялося пагутарыць з тымі, хто не па чутках ведае, як усё адбывалася ў далёкім Афганістане.

Нарадзіўся Ігар Яўгенавіч у 1937 годзе на Кузбасе – у Новакузнецку. У 1954 годзе, пасля заканчэння 10 класаў мясцовай школы, накіраваўся ў Омск, каб паступіць ва ўніверсітэт. Аднак не пашанцавала. Паўгода папрацаваў у тэатры рабочым сцэны і зразумеў, што трэба атрымліваць адукацыю. А тут якраз і ў лісце аб бацькі прачытаў: «Кідай гэтую працу, трэба вучыцца, набываць прафесію». Вярнуўшыся на радзіму, мой суразмоўца паступіў у вучылішча механізацыі сельскай гаспадаркі. З установы Ігар Яўгенавіч выйшаў трактарыстам-машыністам шырокага профілю. На той час гэта была вельмі патрэбная спецыяльнасць разам з патрыятычным рухам «Даеш Цаліну». Хакасія стала адным з цэнтраў асваення некранутых земляў. Туды пацягнуліся эшалоны з маладымі людзьмі, сярод якіх быў і Ігар Макарэвіч. Грандыёзная мэта прадугледжвала правядзенне комплексу мерапрыемстваў, каб ліквідаваць адставанне сельскай гаспадаркі і павялічыць вытворчасць збожжа.

Трэба сказаць, Цаліна патрабавала ад людзей мужнасці і вынослівасці, хоць і пасылалася ў тыя месцы новая тэхніка. Два сезоны Ігар Яўгенавіч сеяў пшаніцу і пахаў землі на вялізных палях, памеры якіх дасягалі 600 гектараў.

У 1957 годзе хлопец быў прызваны на службу ва Узброеныя Сілы. Улан-Удэ, Іркуцк, Чыта, Афганістан, Беларусь – геаграфія гарадоў і краін шырокая. У Іркуцку на танцах на 23 лютага пазнаёміўся з будучай жонкай Галінай Іванавай. Запрасіў на танец, праводзіў да дому – і завязалася сяброўства, якое паступова перайшло ў моцныя пачуцці.

У 1960 годзе, пасля трох гадоў тэрміновай службы, крыху папрацаваў на заводзе ў Іркуцку і перайшоў у ахову вайсковай часці, бо там была магчымасць атрымаць жыллё. А пазней па прапанове саслужыўца пайшоў на звыштэрміновую.

З часам атрымаў спецыяльнасць ваеннага шыфравальшчыка і «засеў» у штабе акругі.

– І што гэта за прафесія?

– У ваеннай сферы такія спецыялісты, як правіла, займаюцца складаннем спецыяльных шыфраў, ключоў да іх, перадачай сакрэтных паведамленняў, перахопам і расшыфроўкай даных ворага. Напрыклад, мне давалі тэкст, а маёй задачай было яго зашыфраваць і адправіць. Такім чынам, з 1966 па 1980-ы служыў у разведвойсках.

У 1980 годзе разам з жонкай прыбылі ў зенітна-ракетную брыгаду, якая дыслакавалася ў вёсцы Межыца. Чатыры гады быў шыфравальшчыкам, а ў 1984 годзе прапанавалі паехаць у Афганістан.

– Маючы двух сыноў, не раздумваў ні хвіліны. Разважаў так: калі я буду ў гарачай кропцы, сыноў ужо туды не накіруюць, – кажа Ігар Яўгенавіч.

Трапіў у саветніцкі апарат, задачай якога было даваць парады іншым афіцэрам. Разам за мужам паехала і Галіна Нікіцічна ў Кандагар. Як адзначае жанчына, даводзілася класціся спаць, а побач заўсёды напагатове стаяла зброя.

– Я нават паспела там пасадзіць невялічкі агародзік і завесці сабачку. Але па стане здароўя праз 7 месяцаў была вымушана пакінуць тую краіну.

Траплялі і пад абстрэл. Так, аднойчы Галіна Нікіцічна працавала ў сваім агародзіку. Ігар Яўгенавіч заўважыў ворагаў і крыкнуў: «Абстрэл!» Толькі паспелі забегчы ў пакой, як пад акном узарвалася міна.

Сям'я Макарэвічаў успамінае Афганістан не толькі як «гарачую» кропку, а і як вельмі прыгожую краіну. Такой прыроды, маўляў, не бачылі нідзе, асабліва парк, які, на жаль, пазней быў знішчаны паветранымі снарадамі.

Падумалася: жонцы ваеннаслужачага заўсёды даводзілася ехаць за мужам, мяняць не толькі месцажыхарства, а і прафесіі.

Гляджу на прыемную, гасцінную жанчыну і думаю: «Якая яна моцная духам!» Гэта ж трэба працаваць у ваеннай часці адразу пасля заканчэння 7-годкі. Ды кім?.. На базе захавання і па рамонце ўзбраення рамантавала аўтаматы. А іншых прафесій на той час і не было ў воінскай часці. Хочацца адзначыць, што Галіна нарадзілася ў сям'і ваеннаслужачага, і маці таксама рупілася на такой жа спецыяльнасці. А вось бацьку свайго жанчына не памятае: як пайшоў на заданне, так і не вярнуся жывым.

– А ці змаглі б зараз узяць у рукі зброю і стрэліць?

– Канечне, без складанасцяў, – з упэўненасцю адказвае Галіна Нікіцічна.

З 1987 года Ігар Яўгенавіч на пенсіі, аднак не сядзеў без справы мужчына, знаходзіў сабе работу. 40 гадоў сям'я Макарэвічаў жыве ў Межыцы. Тут вырасцілі сыноў Алега і Яўгена. Ёсць ужо чатыры ўнукі і праўнук Мікалай.

З 2002 года муж і жонка свой вольны час праводзяць у сезон на агародзе, вырошчваюць бульбу, агуркі і іншую гародніну. Любяць і заляснымі дарамі хадзіць. А зімой дзеля здароўя пасля абеду выходзяць на прагулку. Ад 5 да 8 кіламетраў «намотваюць» па лясной дарозе…

***

Да гэтага часу толькі праездам была ў вёсцы, якая мне чымсьці нагадала курортны гарадок. Шматпавярховікі сярод лесу, рэчка Ула звілiста працякае ў нізіне. Машын на сваім шляху амаль не сустрэлі. Маляўнічы ў нас усе ж такі край!

Тэкст і фота: **Наталля ХРАПАВІЦКАЯ.**